БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце і
адукацыйных інавацыях
_______________ В.Г. Чупрыс
«21» _чэрв.______ 2018 г.

Рэгістрацыйны № УД-_5784_ /вуч.

# ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ
## Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1–24 80 01 Юрыспрудэнцыя

2018 г.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце і
адукацыйных інавацыях
________________В.І. Чупрыс
«21» чэрвеня 2018 г.

Рэгістрацыйны № УД-5984/вуч.

# ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**1–24 80 01 Юрыспрудэнцыя**

2018 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВУ 1-24 80 01 - 2012 па спецыяльнасці 1–24 80 01 Юрыспрудэнцыя (магістратура) ад 24.08.2012 № 108, вучэбнага плана ад 26.05.2017 № Е 24-247/вуч.

**Склададьнікі:**
**Л. Л. Голубева –** дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння**
Кафедрай тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 10 от 16.05.2018)
Вучэбна-метадычнай камісіяй юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 5 ад 19.06.2018)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

## Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны

**Мэтай** вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца вывучэнне працэсу ўзнікнення і развіцця тэарэтычных палажэнняў аб дзяржаве, праве, палітыцы і заканадаўстве, выказаных нацыянальнымі мысліцелямі, рэлігійнымі, грамадскімі і дзяржаўнымі дзеячамі, правазнаўцамі, пісьменнікамі, паэтамі ў той ці іншай форме.

**Задачамі** вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца забеспячэнне сістэмнага засваення курса і фарміраванне дакладных уяўленняў аб храналагічнай паслядоўнасці і этапах развіцця палітычнай і прававой думкі Беларусі, сутнасці важнейшых палітычных і прававых ідэй мінулага, якія выказваліся ў Беларусі з адзінаццатага стагоддзя да нашых дзён, а таксама развіццё юрыдычнага мыслення студэнтаў, у тым ліку – прывіццё навыкаў умелай арыентацыі ў прычынах, гістарычных умовах і асаблівасцях эвалюцыі палітычнай і прававой думкі Беларусі.

**Месца вучэбнай дысцыпліны** ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй (магістра).

Вучэбная дысцыпліна адносіцца да дысцыплін па выбару.

“Палітычная і прававая думка Беларусі” з’яўляецца юрыдычнай дысцыплінай, маючай цесныя функцыянальныя сувязі з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як “Агульная тэорыя права”, “Гісторыя дзяржавы і права Беларусі”, “Гісторыя дзяржавы і права замежных краін”, “Гісторыя палітычных і прававых вучэнняў”, “Канстытуцыйнае права”, “Філасофія”, “Паліталогія”.

## Патрабаванні да кампетэнцый

Засваенне вучэбнай дысцыпліны “Палітычная і прававая думка Беларусі” павінна забяспечыць фарміраванне наступных акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый:

**акадэмічныя кампетэнцыі:**

- дэманстрыраваць веды фундаментальных і прыкладных дысцыплін магістратуры;
- мець здольнасць да самастойнай навукова-даследчай дзейнасці (аналіз, супастаўленне, сістэматызацыя, абстрагіраванне, мадэліраванне, прынацце рашэнняў і інш.), здольнасць генерыраваць і выкарыстоўваць новыя ідэі;
- знаць і ўмець крытычна ацэньваць асноўныя дактрыны, канцэпцыі і тэорыі, якія характарызуюць дынамічны і статычны стан дзяржаўна-прававых феноменаў. Разумець спецыфіку станаўлення і развіцця

вучэнняў аб дзяржаве і праве ў гістарычнай, цывілізацыйнай, светапогляднай перспектыве;
- самастойна набываць новыя веды і уменні, прагназіраваць развіццё дзяржаўна-прававых феноменаў;
- умець правадзіць аналіз крыніц і канцэпцый, сістэматызаваць інфармацыю па пытаннях прафесійнай дзейнасці.

**сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**
- няўхільна выконваць прававыя акты ў прафесійнай і ўсіх іншых сферах сваёй жыццядзейнасці, замацоўваючы місію юрыста не толькі знаць, але і выконваць права;
- выконваць правілы прафесійнай этыкі;
- садзейнічаць веданню, павазе і захаванню Канстытуцыі Беларусі грамадзянамі, арганізацыямі, службовымі асобамі;
- быць здольным да супрацоўніцтва і работы ў камандзе, выконваць працоўную дысцыпліну, добрасумленна выконваць даручаную работу;
- свабодна валодаць і карыстацца дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь і замежнай мовай як сродкам дзелавых зносін
- аб'ектыўна аналізаваць вынікі ўласнай прафесійнай і грамадскай дзейнасці, забяспечваць уласнае інтэлектуальнае, прафесійнае і агульнакультурнае ўдасканаленне;
- аналізаваць і прымаць рашэнні па сацыяльных, этычных, навуковых і тэхнічных праблемах, узнікаючых у прафесійнай дзейнасці;
- адапціравацца да новых сітуацый сацыяльна-прафесійнай дзейнасці, рэалізовываць назапашаны вопыт, свае магчымасці;

**прафесійныя кампетэнцыі:**
- кваліфікавана правадзіць навуковыя даследаванні ў вобласці права;
- выяўляць і прагназіраваць патрэбы ў прававым рэгуляванні;
- кваліфікавана прымяняць нарматыўныя прававыя акты;
- кансультаваць кіраўніка па пытаннях, уваходзячых у кампетэнцыю юрыста;
- выкладаць юрыдычныя дысцыпліны на сучасным навукова-тэарэтычным і метадычным узроўнях ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі;
- кіраваць самастойнай працай навучэнцаў, арганізоўваць іх вучэбна-даследчыцкую дзейнасць;
- эфектыўна ажыццяўляць прававую адукацыю;
- распрацоўваць планы і праграмы арганізацыі інавацыйнай дзейнасці;

рэалізоўваць інавацыйныя праекты.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны магістрант павінен

**ведаць:**

- асноўныя этапы і храналагічную паслядоўнасць станаўлення і развіцця палітычнай і прававой думкі Беларусі;
- прычыны ўзнікнення і развіцця адпаведных ідэй аб дзяржаве, праве, палітыцы і заканадаўстве;
- асноўныя катэгорыі, паняцці і дасягненні, якія характарызуюць узровень гістарычнага развіцця палітычнай і прававой думкі Беларусі;
- сучасныя ідэі аб дзяржаве, праве, палітыцы і заканадаўстве;
- прадстаўнікоў палітыка-прававой думкі Беларусі;
- першакрыніцы па палітычнай і прававой думцы Беларусі.

**умець:**

- характарызаваць важнейшыя дасягненні палітычнай і прававой думкі беларускага народа;
- тлумачыць праблемныя пытанні палітычнай і прававой думкі Беларусі і аргументаваць уласныя пазіцыі;
- тлумачыць развіццё дзяржаўна-прававых інстытутаў у сувязі са з'яўленнем пэўных палітыка-прававых ідэй;
- аналізаваць і сістэматызаваць палітычныя і прававыя ідэі беларускіх асветнікаў;
- вызначаць прычыны, якія выклікалі з'яўленне тых або іншых ідэй аб дзяржаве, праве, палітыцы і заканадаўстве;
- супастаўляць палітычныя і прававыя ідэі беларускіх асветнікаў у межах тэндэнцый развіцця сучаснага грамадства;
- выкарыстоўваць атрыманыя веды для паспяховага засваення галіновых юрыдычных дысцыплін і фарміравання навуковага светапогляду.

**валодаць:**

- паняційным апаратам па вучэбнай дысцыпліне;
- асноўнымі метадамі, спосабамі і сродкамі атрымання, перапрацоўкі гісторыка-прававой інфармацыі;
- навыкамі засваення гісторыка-прававога матэрыялу;
- навыкамі даследчыцкай работы дзеля вырашэння задач у выбранай сферы прафесійнай дзейнасці.
- навыкамі вызначэння залежнасці змяненняў у прававой сістэме ад гістарычных фактараў і заканамернасцей;
- агульнымі для юрыспрудэнцыі катэгорыямі і паняццямі.

**Структура вучэбнай дысцыпліны**

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае такія дыдактычныя адзінкі, як тэмы, у адпаведнасці з якімі распрацоўваюцца і рэалізуюцца

адпаведныя лекцыйныя і семінарскія заняткі. Прыкладная тэматыка семінарскіх заняткаў прыведзена ў інфармацыйна-метадычнай частцы.

Дысцыпліна вывучаецца ў 3 семестры. Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Палітычная і прававая думка Беларусі” адведзена:

144 гадзіны, у тым ліку 44 аўдыторных, з іх: лекцыі – 32 гадзіны, семінарскія заняткі – 12 гадзін.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 4 заліковыя адзінкі.

Форма цякучай атэстацыі – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Тэма 1.
### Прадмет і метадалогія палітычнай і прававой думкі Беларусі як навукі і вучэбнай дысцыпліны.

Прадмет палітычнай і прававой думкі Беларусі. Суадносіны філасофскага, гістарычнага, юрыдычнага аспекту пры вывучэнні дысцыпліны. Сумежныя навукі: тэорыя і гісторыя дзяржавы і права, гісторыя палітычных і прававых вучэнняў, філасофія, паліталогія, гісторыя. Месца палітычнай і прававой думкі Беларусі ў сістэме юрыдычных дысцыплін.

Метадалагічныя праблемы палітычнай і прававой думкі Беларусі. Філасофскія і спецыяльна-навуковыя метады навуковага пазнання, якія выкарыстоўваюцца палітычнай і прававой думкай Беларусі як гуманітарнай дысцыплінай. Гістарычны і гістарычна-параўнальны метады пазнання. Суадносіны гістарычнага і палітычнага метадаў.

Задачы палітычнай і прававой думкі Беларусі.

Крыніцы па палітычнай і прававой думцы Беларусі. Выданне першакрыніц.. Сувязь палітычнай і прававой думкі Беларусі з іншымі навукамі.

Значэнне палітычнай і прарвавой думкі ў фарміраванні палітычнай і прававой культуры.

### Тэма 2.
### Палітычная і прававая думка ў перыяд Сярэднявечча.

Асноўныя фактары, якія ўплывалі на фарміраванне палітычнай і прававой думкі Беларусі са старажытных часоў да XIII ст. Прыняцце хрысціянства. З’яўленне царкоўна-палітычнай ідэалогіі. Ідэі цэзарапапізму. Палітыка-прававая думка на старажытнабеларускіх землях. Грамадска-палітычныя погляды Е. Полацкай, К. Смаляціча, К. Тураўскага, А. Смаленскага і інш. Ідэя няхцівасці К. Смаляціча.

Палітычныя ідэі старажытнарускіх летапісаў (“Аповесць мінулых гадоў”, “Слова пра паход Ігаравы”).

Палітычная і прававая думка XIII – XV стст. Прыняцце каталіцызму, знаемства з заходне-еўрапейскай царкоўна-палітычнай ідэалогіяй папства (папацэзарызму). Галоўныя тэзісы папацэзарызму. Пасланне “Дыктат папы”. Уплыў царкоўна – палітычнай ідэалогіі каталіцызму на палітыка-прававую думку Вялікага Княства Літоўскага.

Сярэдневяковыя ерасі (багамільства, гусізм). Рэлігійна-палітычныя супярэчнасці ў XVI ст. і іх адлюстраванне ў палітычнай і прававой думцы.

Стварэнне аўтакефальнай (незалежнай) праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Грамадска-палітычныя погляды і царкоўная дзейнасць Р. Цамблака.

Беларуска-літоўскія летапісы і хронікі, як крыніцы актуальных грамадска-палітычных ідэй XIV – XVстст. ("Летапіс вялікіх князеў літоўскіх", "Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.", "Хроніка Быхаўца" і інш.).

## Тэма 3.
## Палітычная і прававая думка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі.

Гуманізм – новы светапогляд канца XV – пачатку XVI стст. Асноўныя ідэі і прынцыпы эпохі Адраджэння, іх асаблівасці ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Ф. Скарына. Прадмовы і пасляслоўі – галоўныя крыніцы вывучэння светапогляду Ф. Скарыны. Палітычныя і прававыя погляды Ф. Скарыны. Палітычны ідэал Ф. Скарыны. Ф. Скарына аб заканадаўстве. Класіфікацыя права, прапанаваная Ф. Скарынам. Натуральнае ("прироженое") права. Пісанае права: боскае, царкоўнае (кананічнае) і земскае. Паспалітае права. Мэта крымінальнага пакарання. Адвакацкая дзейнасць Ф. Скарыны. Ідэя адзінства і дружбы славянскіх народаў, іх роля ў гісторыі чалавецтва.

М. Гусоўскі. Палітычныя і прававыя погляды М. Гусоўскага. Актуальныя палітычныя праблемы ў творы "Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго".

М. Літвін. Палітычныя і прававыя погляды М. Літвіна. Сацыяльна-палітычны трактат "Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян". Недахопы судовай сістэмы, узнятыя М. Літвінам у трактаце. М. Літвін аб палітычных рэформах, аб унясенні змен у заканадаўства, рэфармаванні дзяржаўнага кіравання, судаўладкаванні.

Ідэі Рэфармацыі ў ВКЛ. Роля Рэфармацыі ў развіцці нацыянальнай філасофскай, грамадска-палітычнай і прававой думкі, беларускай мовы, нацыянальнай культуры, у абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа.

Уплыў заходнееўрапейскіх рэфармацыйных ідэй на развіццё палітычнай і прававой думкі ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Крыніцы рэфармацыйных ідэй. Асноўныя напрамкі рэфармацыйнага руху – лютэранства, кальвінізм, арыянства (антытрынітарызм). Арыянства ў Вялікім Княстве Літоўскім. Аналіз паходжання і сутнасць паняццяў: арыяне, антытрынітарыі, сацыніяне, унітарыі (унітарыяне). Два напрамкі арыянства. Адносіны арыян да ўласнасці і да дзяржавы. А. Кульва – прапаведнік лютэранскіх ідэй у Вялікім Княстве Літоўскім. Рэспубліканскія і

дэмакратычныя ідэі кальвінізму. М. Радзівіл Чорны – ідэолаг кальвінізму, галоўны ініцыятар распаўсюджвання кальвінізму ў Вялікам Княстве Літоўскім. “Брэсцкая, альбо Радзівілаўская Біблія”.

Грамадска-палітычная дзейнасць А. Валовіча, яго палітычныя і прававыя погляды.

А. Волан, як тэарэтык кальвінізму. Палітычныя і прававыя погляды А. Волана. Паходжанне і сутнасць дзяржавы. Паходжанне права, уплыў розных сацыяльных груп на фарміраванне прававых норм. Асноўныя прынцыпы права. Пытанні ўдасканальвання заканадаўства. А. Волан аб форме дзяржаўнага кіравання, аб саслоўным дзяленні грамадства.

Ян Кішка, як ідэолаг правай (памяркоўнай) плыні арыянства.

С. Будны. “Катэхізіс” С. Буднага. Справядлівыя і несправядлівыя войны. Твор кальвінісцкага зместу “Пра апраўданне грэшнага чалавека перад богам”. Галоўны твор “Пра свецкую ўладу”. Адносіны да дзяржавы і дзяржаўных установ, да прыватнай уласнасці. Палітычны ідэал С. Буднага.

Грамадска-палітычныя погляды В. Цяпінскага-Амельяновіча. “Евангелле” – выдатны помнік перадавой грамадска-палітычнай думкі XVI ст.

Ідэалогія левага крыла арыян (П. Гезка, М. Чаховіц, Л. Крышкоўскі, Якуб з Калінаўкі, Павел з Візны і інш.). Іх адносіны да дзяржавы, уласнасці, удзелу хрысціян у войнах.

Л.І. Сапега – дзяржаўны дзеяч, законатворца, суддзя. Яго роля ў стварэнні Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага. Л. Сапега і Статут ВКЛ 1588 г. Погляды Л. Сапегі на дзяржаву і права. Катэгорыя свабоды. Канцэпцыя прававой дзяржавы ў прадмовах да Статута ВКЛ 1588 г.: “Прысвячэнні” выдання Статута каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму Жыгімонту III Вазе і “Звароце” да ўсіх саслоўяў (грамадзян) ВКЛ. Погляды Л. Сапегі на заканадаўства. Эпісталярная спадчына Л. Сапегі (Ліст Л. Сапегі да біскупа І. Кунцэвіча (1622)), самастойная праца Л. Сапегі “Выклад трыбунальскіх праў” (1616) – помнікі нацыянальнай юрыдычнай думкі.

Л. Сапега і беларускае нацыянальнае Адраджэнне.

## Тэма 4.
## Палітычная і прававая думка перыяду Контррэфармацыі, крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін і панавання клерыкальнай ідэалогіі.

Узнікненне Контррэфармацыі ў Еўропе, яе сутнасць, мэты. Трыдэнцкі сабор. Распаўсюджванне контррэфармацыйных ідэй у Вялікім Княстве

Літоўскім. “Індэкс забароненых кніг”. Дзейнасць ордэна езуітаў. Характэрныя рысы езуіцкага выхавання. Адкрыцце езуіцкіх сярэдніх вучэбных устаноў – калегіумаў. Стварэнне Віленскай езуіцкай акадэміі.

Брэсцкая царкоўная ўнія – імпульс у развіцці палітыка-прававой думкі Беларусі XVI – XVII стст. П. Скарга – галоўны ініцыятар заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі, лідэр Контррэфармацыі, першы рэктар Віленскай езуіцкай акадэміі. Погляды П. Скаргі на грамадскі і дзяржаўны лад, на заканадаўства сучаснай яму дзяржавы. “Соймавыя казанні” як крыніца для вывучэння палітыка-прававых поглядаў П. Скаргі. Палітычны ідэал П. Скаргі. Ідэалагічнае абгрунтаванне неабходнасці царкоўнага аб’яднання праваслаўных з каталікамі Рэчы Паспалітай. Твор П. Скаргі “Аб адзінстве царквы божай”.

А. Пасевін – ініцыятар заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі. “Moscovia” – каштоўная крыніца па грамадска-палітычнай і прававой думцы Беларусі XVI ст.

Палітыка-прававыя погляды прыхільнікаў і праціўнікаў уніі. І. Пацей – ініцыятар заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі. “Артыкулы (умовы) уніі”, “Саборнае пасланне да папы” – дакументы для падпісання ўніі. Роля І. Пацея і К. Тарлецкага ў падпісанні дакументаў уніі. “Унія альбо выклад преднейших артикулов к зъедночению греков з костелом римским” – тэарэтычнае абгрунтаванне неабходнасці царкоўнай уніі. І. Пацей – прыхільнік тэакратыі. Ідэя ўмацавання каралеўскай улады. “Ерасі...”, “Гармонія...”.

К. Астрожскі. Культурна-асветніцкая дзейнасць К. Астрожскага супраць каталіцкай ідэалогіі. Роля князя Андрэя Курбскага ў фарміраванні светапогляду К. Астрожскага. “Астрожская Біблія” (1581). Астрожская Акадэмія (1580) – вышэйшая праваслаўная навучальная ўстанова. Яе роля ў фарміраванні светапогляду беларускага народа. Пасланне К. Астрожскага да праваслаўных Рэчы Паспалітай.

Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі. Іх культурна-асветніцкая дзейнасць і яе ўплыў на развіцце палітычнай і прававой думкі. “Катэхізіс”, “Казанне святога Кірыла” і інш.

Уніяты (уніты, грэкакаталікі), дызуніяты (дызуніты), дысідэнты. Праблема ўзаемаадносін каталікаў і некатолікаў (дысідэнтаў), іх роля ў грамадска-палітычным жыцці.

Палітычныя і прававыя ідэі ў рэлігійна-палемічнай літаратуры. Палітычныя і прававыя погляды прыхільнікаў уніі: Іосіфа Руцкага, Іасафата Кунцэвіча, Льва Крэўзы, Анастасія Сялявы, Іллі Марахоўскага і інш.

Погляды прыхільнікаў праваслаўя: Ляонія Карповіча, Іоа Барэцкага, Андрэя Мужылоўскага, Захарыя Капысценскага і інш.

Х. Філалет. “Апокрысіс, альбо адказ на кніжкі пра сабор Берасцейскі” – адказ на твор П. Скаргі “Сабор Брэсцкі...”.

М. Сматрыцкі. “Фрынас, альбо лямант усходняй царквы”. Крытыка каталіцкай царквы і яе духавенства, царкоўна-палітычнай ідэалогіі папства, абвяржэнне догматаў каталіцызму. Палітыка-прававыя праблемы, узнятыя М. Сматрыцкім. Яго класіфікацыя права. Роля звычаевага (“няпісанага”) права. “Граматыкі славенскай”. Паўстанне віцебскіх праваслаўных гараджан (1623) – пераломны момант у духоўным жыцці М. Сматрыцкага. “Апалогія...”, “Разважанне пра шэсць розніц паміж Усходняй і Заходняй цэрквамі”, “Пратэстацыя” і інш.

А. Філіповіч. “Дыярыуш” (“Дзеннік”, 1646). Палітычныя і прававыя погляды. А. Філіповіч, як прыхільнік ідэі адзінства славянскіх народаў.

Пачатак вышэйшай юрыдычнай адукацыі ў Беларусі і Літве. Роля Казіміра Льва Сапегі ў адкрыцці юрыдычнага факультэта ў складзе Віленскай езуіцкай Акадэміі (1641).

Аарон (Адам, Аляксандр) Алізароўскі – прафесар цывільнага, кананічнага права юрыдычнага факультэта. “Аб палітычнай супольнасці людзей” (1651) – галоўная праца жыцця А. Алізароўскага. Яго класіфікацыя права. Палітычныя і прававыя погляды А. Алізароўскага.

К. Лышчынскі – выразнік інтарэсаў радыкальных слаеў гараджан, прагрэсіўнай інтэлігенцыі, прадстаўнік утапічнага сацыялізму ў Беларусі. Яго твор “Аб неіснаванні бога”. Матэрыялістычныя і атэістычныя ідэі.

С. Полацкі. Грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць С. Полацкага. Палітычныя і прававыя ідэі. Два перыяды яго жыцця: беларускі і маскоўскі. “Буквар” (1679), “Псалтыр рыфматворны” (1680) – асноўныя працы беларускага перыяду. Патрыятызм – характэрная рыса духоўнай спадчыны С. Полацкага беларускага перыяду.

С. Полацкі – прыхільнік і праваднік ідэалогіі асветніцкага абсалютызму ў Расіі. Асветніцкая манархія, як форма дзяржаўнага кіравання. Праблема асветнага манарха. Прававыя погляды С. Полацкага. Яго гуманістычныя ідэі.

А. Белаблоцкі, І. Капіевіч – прадаўжальнікі традыцый С. Полацкага. Грамадска-палітычныя погляды А. Белаблоцкага. “Кароткая гутарка літасці з ісцінай” (1685), “Вялікая навука Раймунда Лулія” (1688-1689), “Кніга філасофская” (пачатак XVIII ст.), “Пентатэўгум, альбо Пяць кніг кароткіх” (сярэдзіна 90-х гадоў XVII ст.). Грамадска-палітычныя погляды і выдавецкая дзейнасць І. Капіевіча.

**Тэма 5.**

**Палітычная і прававая думка веку Асветы.**

Зараджэнне асветніцкай ідэалогіі ў Беларусі (сярэдзіна XVIII ст.). Новы этап у развіцці грамадска-палітычнай і прававой думкі Беларусі. Я. Ябланоўскі, С. Ляшчынскі, С. Канарскі – прадвеснікі рэфармавання грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай. Я. Ябланоўскі і яго праца “Што робіцца без усялякага сораму ў Польшчы, альбо тлумачэнне грахоў для народа нашага прывычных” (1669-1731). С. Ляшчынскі супраць прыгоннага права ў працы “Вольны голас у абарону свабоды” (1733). Рэформы ў сацыяльнай і палітычнай сферах. Асноўныя напрамкі рэфармавання існуючага грамадскага ладу С. Канарскага. Праект стварэння новай сістэмы навучання. “Збор законаў” (“Volumina legume”) – навуковая крыніца для вывучэння палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI – XVIII стст. Палітычны трактат “Аб эфектыўным правядзенні нарадаў” (1760). Ідэі радыкальнай рэфармы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай у духу асветніцкага абсалютызму.

Праблема дысідэнтаў у Рэчы Паспалітай (XVIII ст.). Георгій Каніскі. Палітычныя і прававыя погляды Г. Каніскага. “Правы і свабоды дысідэнтаў” (1767) – праграма барацьбы хрысціян-некатолікаў за ўраўноўванне іх правоў з большасцю каталіцкага насельніцтва.

Рэфармаванне сістэмы адукацыі і выхавання ў Беларусі ў адпаведнасці з ідэямі французскіх асветнікаў XVIII ст. Адукацыйная камісія — першае ў Еўропе Міністэрства народнай адукацыі. Пераўтварэнне Віленскай езуіцкай акадэміі ў Галоўную школу Вялікага Княстсва Літоўскага. Факультэты маральных і фізічных навук, медыцынскі факультэт Галоўнай школы ВКЛ. М. Пачобут-Адляніцкі – першы рэктар Галоўнай школы ВКЛ. Яго рэфарматарская дзейнасць і грамадска-палітычныя погляды. М. Пачобут – прыхільнік асветніцкай тэорыі прагрэсу.

Антыпрыгонніцкія ідэі асветнікаў. М. Карповіч, К. Багуслаўскі, Д. Пільхоўскі. Праца К. Багуслаўскага “Аб дасканалым заканадаўстве”.

Фізіякратызм – аснова рэфармавання дзяржаўнага ладу. Сутнасць ідэалогіі фізіякратызму. І. Страйноўскі і яго праца “Навука натуральнага і палітычнага права, палітычнай эканоміі і права народаў” (1785). І. Храптовіч і яго праца “Аб натуральным праве” (1814). Тэорыя натуральнага права і дагаворнага паходжання дзяржавы ў працах І. Страйноўскага, І. Храптовіча. Асветніцкая і рэфарматарская дзейнасць А. Тызенгауза. Тызенгаўза рэформы.

Ідэі рэфармавання дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай: К. Нарбут, С. М. Аскерка.

Палітычныя і прававыя ідэі Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. і яе ўплыў на развіцце беларускай палітыка-прававой думкі.

Радыкальны напрамак палітычнай думкі. Палітычныя і прававыя ідэі лідэраў паўстання 1794 г. Андрэй Тадэвуш Касцюшка і яго праца "Ці могуць палякі дабіцца незалежнасці?". "Паланецкі ўніверсал 1794 г." Рэспубліканскія і дэмакратычныя ідэі Я. Ясінскага.

Ідэі ўтапічнага сацыялізму. Праграма радыкальнай перабудовы грамадства І. Яленскага. "Благавешчанне". Ідэал свабоднага грамадства С. Зяновіча ў працы "Сапраўднае тлумачэнне правоў чалавека". Павел Бжастоўскі і "Паўлаўская рэспублік".

## Тэма 6.
## Палітычная і прававая думка канца XVIII – пачатку XX ст. (1795 – 1905).

Уплыў рассійскай, польскай палітычнай і прававой ідэалогіі на развіцце палітыка-прававой думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі.

Палітычная і прававая думка Беларусі ў першай палове XIX ст. Асноўныя напрамкі ў развіцці думкі: лібералізм, кансерватызм, рэвалюцыйны дэмакратызм. Асноўнае пытанне нацыянальнай палітыка-прававой думкі: адраджэнне дзяржаўнасці, пошук шляхоў да нацыянальнай самастойнасці.

Асноўныя сацыяльна-палітычныя праблемы ліберальнай думкі. Віленскі ўніверсітэт – цэнтр асветы і перадавой грамадска-палітычнай і прававой думкі, цэнтр лібералізму. Ідэі беларускіх лібералаў: братоў Яна і Енджэя Снядэцкіх, В. Страйноўскага, Я. Зноскі, М. Бабροўскага і інш. Палітычныя і прававыя погляды сяброў тайных студэнцкіх таварыстваў Віленскага ўніверсітэта – філаматаў, філарэтаў, праменных і інш. Адам і Аляксандр Міцкевічы, Т. Зан, Я. Чачот і інш. Роля прац І. Даніловіча, І. Лялевеля, М. Бабροўскага ў стварэнні тайных студэнцкіх таварыстваў. Праграмныя ўстаноўкі тайных студэнцкіх таварыстваў. Асноўныя прынцыпы іх дзейнасці. Катэгорыя свабоды.

Палітычны рамантызм.

Кансерватызм. Ігнат Лабажэўскі.

Палеміка паміж лібераламі і кансерватарамі (клерыкаламі). Полацкая езуіцкая акадэмія – цэнтр клерыкальных ідэй. "Віленскі дзеннік" (Вільня), "Полацкі штомесячнік" (Полацк), "Вулічныя навіны". Таварыства "шубраўцаў. Я. Шымкевіч, Л. Бароўскі, І. Шыдлоўскі і інш.

Кансерватыўны напрамак у развіцці думкі ў 30-50-х гг. XIX ст. Г. Ржавускі, І. Галавінскі, К. Буйніцкі, І. Пржацлаўскі, І. Шцірмер, М. Грабоўскі. Часопіс “Рубон”.

Уплыў паўстання 1830-1831 гг. на развіцце беларускай палітыка-прававой думкі.

Рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак у развіцці палітычнай і прававой думкі. М. Валовіч, Ф. Савіч, Ю. Бакшанскі. Рэвалюцыйная арганізацыя “Дэмакратычнае таварыства”.

Уплыў рэвалюцыі 1848 г. у Заходняй Еўропе на палітычную думку Беларусі. Браты Аляксандр і Франц Далеўскія. Рэвалюцыйная арганізацыя “Братні саюз літоўскай моладзі”.

Палітычная і прававая думка Беларусі ў другой палове XIX ст.

Адраджэнне лібералізму ў канцы 50-х – пачатку 60-х гг. Браты Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы, М. Балінскі, Т. Нарбут, Ю. Крашэўскі і інш.

А. Кіркор і ліберальны часопіс “Віленскі партфель”. Роля часопіса ў адраджэнні беларускага лібералізму. А. Аскерка, В. Старжынскі.

Ідэалогія рэвалюцыйных дэмакратаў. І. Агрызка і газета “Слова”. Праграма барацьбы за палітычнае, сацыяльнае і духоўнае разняволенне беларускага народа Вінцэнта Канстанціна Каліноўскага. “Мужыцкая праўда”. Ідэі аб выхаванні К Каліноўскага. Палітычны ідэал К. Каліноўскага. Канцэпцыя дэмакратычнай рэвалюцыі. Прававыя погляды К. Каліноўскага. Яго ідэі аб судаводстве.

Палітычны радыкалізм. Народніцкі рух Беларусі – частка агульнарасійскага руху 70-х – пачатку 80-х гг. XIX ст. Праграмныя патрабаванні рэвалюцыйных народнікаў. М. Судзілоўскі, С. Кавалік, Р. Ісаеў, І. Грынявіцкі і інш. Часопіс “Гоман”. Палітычная праграма “Гомана”.

Распаўсюджванне марксізму ў Беларусі. Марксісцкае вучэнне аб дзяржаве. Э. Абрамовіч, І. Гурвіч. Марксісцкія гурткі ў Беларусі. Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ). Праграма БСГ.

Ліберальныя народнікі. Ідэалогія ліберальнага народніцтва. Газета “Минский листок”.

У. Спасовіч, А. Петражыцкі, І. Файніцкі.

## Тэма 7.
## Палітычныя і прававая думка ў XX ст. (1919-1991 гг.)

Уплыў дакументаў першага і другога Ўсебеларускага з’ездаў Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў на развіцце беларускай грамадска-палітычнай думкі. Развіцце марксісцкай тэорыі.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1921), Інстытут філасофіі і права АН БССР (1931) — цэнтры марксісцкай палітыка-прававой думкі Беларусі. Канстытуцыі БССР 1919, 1927, 1937 і 1978 гг. – юрыдычная база для распрацоўкі нацыянальнага заканадаўства.

Палітычная і прававая думка Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.). Камуністычная партыя Заходняй Беларусі. Ідэалогія палітычных партый і грамадскіх рухаў. Беларуская сялянска-рабочая грамада, Змаганне і інш.

Дзейнасць і погляды В.Г. Кнорына, А.Ф. Мяснікова, А.Р. Чарвякова, І.Д. Луцкевіча (Янкі Купалы), К.М. Міцкевіча (Якуба Коласа), П.К. Панамарэнка, К.Т. Мазурава, П.М. Машэрава, І. Дварчаніна, Б. Тарашкевіча, А. Станкевіча, Я. Пятроўскага і інш.

## Тэма 8.
## Палітычная і прававая думка канца XX – пачатку XXI ст. (1991 – цяперашні час).

Узнаўленне самастойнасці Беларусі і актывізацыя палітыка-прававой думкі ў 90-х гадах XX ст. Палітычныя партыі і грамадскія рухі ў Рэспубліцы Беларусь. Іх ідэі.

І.У. Вішнеўская, Л.Л. Голубева, Т.І. Доўнар, С.А. Падокшын, С.Ф. Сокал, В.Ф. Шалькевіч і інш. — даследчыкі развіцця беларускай палітычнай і прававой думкі.

Юрыдычная адукацыя ў сучасны перыяд.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## па спецыяльнасці 1–24 80 01 Юрыспрудэнцыя

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | Тэма 1. Прадмет и метадалогія палітычнай і прававой думкі Беларусі як навукі і вучэбнай дысцыпліны. | 2 | | 1 | | | | Абмеркаванне |
| 2 | Тэма 2. Палітычная і прававая думка ў перыяд Сярэднявечча. | 4 | | 1 | | | | Апытанне, контрольная работа, рэфераты, калоквіум. |
| 3 | Тэма 3. Палітычная і прававая думка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі. | 6 | | 2 | | | | Апытанне, даклад, складанне і прадстаўленне прэзентацый. |
| 4 | Тэма 4. Палітычная і прававая думка перыяду Контррэфармацыі, крызісу | 6 | | 2 | | | | Апытанне, одкрытае эўрыстычнае заданне, калоквіум. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | феадальна-прыгонніцкіх адносін і панавання клерыкальнай ідэалогіі. | | | | | | | |
| 5 | Тэма 5. Палітычная і прававая думка веку Асветы. | 4 | | 2 | | | | Обмеркаванне, эссэ, одкрытае эўрыстычнае заданне. |
| 6 | Тэма 6. Палітычная і прававая думка канца XVIII – пачатку XX ст. (1795 – 1905). | 4 | | 2 | | | | Апытанне, даклады, рефераты, групавая работа. |
| 7 | Тэма 7. Палітычныя і прававая думка ў XX ст. (1919-1991 гг.) | 4 | | 1 | | | | Апытанне, одкрытае эўрыстычнае заданне, электронныя тэсты |
| 8 | Тэма 8. Палітычная і прававая думка канца XX – пачатку XXI ст. (1991 – цяперашні час). | 2 | | 1 | | | | Апытанне, кантрольная работа, рэфераты, калоквіум. |
| **Усяго па дысцыпліне:** | | **32** | | **12** | | | | **Экзамен** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. *Авакян, Г.С.* Палітычныя мысліцелі і гуманісты Беларусі / Г.С. Авакян, М.В. Кузняцоў, М.П. Сінькевіч. Мінск : Элайда, 2002. – 96 с.

2. Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. Даведнік / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2001. – 496 с.

3. Белорусская юридическая энциклопедия : в 4 т. – Минск : ГИУСТ БГУ, 2007 – 2011. – 3 т.

4. Беларускія летапісы і хронікі. – Мінск : Міжнар. фонд "Бел. кнігазбор", 1997. — 430 с.

5. Бирало, А.А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII – середине XVIII вв. /А.А. Бирало. – Минск : Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1971. – 180 с.

6. Васілевіч, Р.А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі / Р.А. Васілевіч, Т.І. Доўнар, І.А. Юхо. – Мінск : ВТАА “Права і эканоміка”, 2001. – 363 с.

7. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / І.У. Вішнеўская. – Мінск : Тэсей, 2004. — 271 с.

8. Вялікае княства Літоўскае: у 2 т. – Мінск : БелЭН, 2005 – 2006. – 2 т.

9. Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. Т. 3. Дадатак. А – Я / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – 696 с.

10. Гісторыя і сучаснасць: беларуская дзяржаўнасць ва ўсходнееўрапейскім кантэксце: зборнік навуковых прац, прысвечаных 90-годдзю з дня нараджэння прафесара І.А. Юхо / рэдкал.: С.А. Балашэнка (гал. рэд.) і [інш.]. – Мінск : Бизнесофсет, 2012. – 552 с.

11. Голубева, Л.Л. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : вучэб.-метад. комплекс / Л.Л. Голубева. – Мінск : ГИУСТ БГУ, 2005. – 84 с.

12. Голубева, Л.Л. Да пытання аб перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі // Актуальные вопросы совершенствования правовой системы на современном этапе : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 11 – 12 окт. 2012 г. / редкол.: С.А. Балашенко (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Бизнесофсет, 2012. – С. 56 – 57.

13. Доўнар, Т.І. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI–XVIII стст.: хрэстаматыя / Т.І. Доўнар, Ю.П. Доўнар, Л.Л. Голубева ; пад рэд. Т.І. Доўнар. – Мінск : БДУ, 2004. – 206 с.

14. Козел, А.А. История философской мысли Беларуси (XII–XX вв.) : учеб. пособие / А.А. Козел. – Минск : Академия МВД Республики Беларусь, 1998. – 143 с.

15. Козел, А.А. Философская мысль Беларуси / А.А. Козел. – Минск : Амалфея, 2004. – 352 с.

16. Конон, В.М. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии до 1917 г. / В.М. Конон, С.А. Подокшин, Н.И. Прашкович. – Минск : Наука и техника, 1973. – 557 с

17. Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыкл. даведнік / гал. рэд. Б.І. Сачанка. – Мінск : БелЭн, 1995. – 671 с.

18. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии: до 1917 года / редкол. : К.П. Буслов (отв. ред.) [и др.] – Минск : Наука и техника, 1973. – 557 с.

19. Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 316 с.

20. Падокшын, С.А. Палітычная і прававая думка Беларусі XVI–XVII стст. / С.А. Падокшын, С.Ф. Сокал. – 2-е выд. дап. – Мінск : Права и эканоміка, 2000. – 120 с.

21. Падокшын, С.А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI–XVII стст. / С.А. Падокшын ; навук. рэд. А.С. Майхровіч. – Мінск : Бел.навука, 2004. – 151 с.

22. Памятники философской мысли Беларуси XVII–первой половины XVIII в. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 486 с.

